# Заканадаўчае забеспячэнне выбараў у Расійскую дзяржаўную Думу і выбарчыя правы насельніцтва Беларусі (1906 — 1917)

М. М. Забаўскі, доктар гістарычных навук, прафесар

Анатацыя. *У артыкуле адлюстраваны сутнасць выбарчага заканадаўства па выбарах у Дзяржаўную думу Расіі першага і другога скліканняў, яго змены адпаведна выбарчаму закону ад 3 чэрвеня 1907 г., паказаны асаблівасці заканадаўчых актаў для беларуска-літоўскіх губерняў і выбарчыя правы насельніцтва ў 1906—1917 гг.*

Summary. *The article reveals the essence of the electoral law concerning the elections to the First and the Second State Dumas, its modifications in accordance with the electoral law of June 3, 1907. Besides, the peculiarities of legislative acts for Belarusian and Lithuanian provinces and electoral rights of voters in 1906—1917 years are presented in the article.*

Ключавыя словы: *беларуска-літоўскія губерні, выбарчы закон, выбары, права голасу, нацыянальныя і сацыяльныя курыі (разрады выбаршчыкаў), Дзяржаўная дума, нацыянальнае пытанне.*

Keywords: *Belarusian and Lithuanian provinces, electoral law, elections, electoral rights, national and social categories of voters, the State Duma, national question.*

Уводзіны. Для любой цывілізаванай краіны найважнейшымі праблемамі грамадска-палітычнага жыцця з'яўляюцца ўзаемаадносіны грамадства і ўладных структур, элементаў грамадзянскай супольнасці ў працэсе іх развіцця і інш. Такія тэрміны, як «беларуска-літоўскія губерні», «выбары», «права голасу», «выбарчая кампанія», «нацыянальныя і сацыяльныя курыі», мелі шырокі ўжытак у гісторыі Беларусі яшчэ напачатку XX ст. і не сыходзілі са старонак перыядычных выданняў.

На працягу двух апошніх дзесяцігоддзяў усё больш даследчыкаў звяртаецца да гісторыі выбараў у Расіі, прадстаўнічых устаноў. Асаблівую цікавасць набыла гісторыя Расійскай Дзяржаўнай думы I—IV скліканняў (1906—1917).

Асноўная частка. Выбарчыя кампаніі, дзейнасць прадстаўнікоў нацыянальных эліт у Думе грунтоўна распрацаваны ў працах Р. Ціунчука [1]. Неабходна нагадаць важнасць мемуарнай літаратуры, аўтары якой прымалі непасрэдны ўдзел у падзеях першай Расійскай рэвалюцыі, сталыпінскіх мерапрыемствах, Першай сусветнай вайне і інш. Да іх ліку адносяцца ўспаміны С. Крыжаноўскага (1880—1935), тайнага дарадчыка, аднаго з кіраўнікоў расійскай палітыкі; Д. Шыпава (1851—1920) —

старшыні маскоўскай губернскай земскай управы; М. Таганцава (1843—1923) — юрыста, дзяржаўнага і грамадскага дзеяча.

З айчынных даследчыкаў па акрэсленай праблематыцы вызначым працы М. Забаўскага [2], А. Смалянчука [3], Д. Лаўрыновіча [4], К. Бандарэнкі [5] і інш. Ідэям аўтанамізму ў пачатку XX ст., якія падтрымлівалі многія кадэты, выхадцы з беларускіх губерняў, прысвечаны навуковыя артыкулы М. Казіцкага і Я. Запрудніка [6].

Актуальнасць даследавання айчыннай электаральнай гісторыі тлумачыцца яе магчымасцю аналізаваць гісторыю інстытута выбараў, выбарчага права і яго ўплыву на свядомасць грамадства. Акрэсленая намі праблематыка стымулюе з'яўленне новых прац, так ці інакш звязаных з выбарамі па паліталогіі, статыстыцы, юрыспрудэнцыі, праве і інш.

Звернемся да праектаў увядзення ў Расіі народнага прадстаўніцтва, з якімі непарыўна звязана і гісторыя выбарчага права. Так, у 1809 г. з ведама Аляксандра I быў распрацаваны праект М. М. Сперанскага, у якім планавалася надзяліць заканадаўчымі правамі Дзяржаўную думу, члены якой абіраліся б на тры гады дэпутатамі губернскіх дум і зацвярджаліся імператарам. Новы праект пад назвай «Дзяржаўная ўстаўная грамата Расійскай імперыі» прадстаўлены ў 1820 г., аднак рэалізаваны не быў.

На мяжы 70—80-х гг. XIX ст. абмяркоўваліся ўжо чатыры праекты: міністра ўнутраных спраў П. А. Валуева, вялікага князя Канстанціна Мікалаевіча, шэфа жандараў П. А. Шувалава, і новыя, якія былі падрыхтаваны міністрамі ўнутраных спраў М. Г. Лорыс-Мелікавым і Д. П. Ігнацьевым. Але пасля забойства Аляксандра II у 1881 г. ніводны з праектаў не быў ажыццёўлены.

У ліпені 1904 г. у Пецяргофе пачаліся нарады наконт праекта Дзяржаўнай думы. У іх удзельнічалі некалькі дзясяткаў чалавек — вялікія князі, міністры, члены Дзяржаўнага Савета, а таксама вядомы гісторык прафесар В. О. Ключэўскі. Праект, які абмяркоўваўся з 19 па 26 ліпеня, быў заканадаўча аформлены ў актах ад 6 жніўня 1906 г.: маніфестах «Аб устанаўленні Дзяржаўнай думы», «Устанаўленне Дзяржаўнай думы», «Палажэнні аб выбарах у Дзяржаўную думу».

Паводле «Палажэння аб выбарах у Дзяржаўную думу» ўсе выбаршчыкі падзяляліся на тры курыі (г. зн. разрад выбаршчыкаў, аб'яднаных формай уласнасці ці прыналежнасцю да пэўнага саслоўя): землеўладальніцкую (памешчыкі), гарадскую (буржуазія) і сялянскую. Дзве першыя курыі мелі перавагу на выбарах. Для іх выбары былі двухступеннымі. Для сялян, якія вялі ўласную гаспадарку, сістэма выбараў ускладнялася. На першай стадыі сяляне выбіралі дзесяцідворных на валасны сход. На валасных сходах выбіраліся ўпаўнаважаныя (па два ад кожнага) на павятовы сход, на якім зноў выбіраліся ўпаўнаважаныя на губернскі выбарчы сход. Там выбаршчыкі ад сялян, памешчыкаў і буржуазіі ўдзельнічалі ў выбранні дэпутатаў Думы. Прадугледжваўся высокі маёмасны і ўзроставы цэнз. На з'езд павятовых землеўладальнікаў, напрыклад, запрашаліся ўласнікі з маёмасцю не менш за 15 тыс. руб., на гарадскія з'езды — уласнікі з нерухомай маёмасцю не менш за 1500 руб. (у сталіцах — 3000 руб.) [2, с. 26].

У разгар Снежаньскага паўстання быў выдадзены ўказ «Аб змяненні Палажэння аб выбарах у Дзяржаўную думу» і выдадзены дадатак да яго ўзаконенняў, пашырыўшы кола выбаршчыкаў у параўнанні з Палажэннем ад 6 жніўня 1905 г. Палажэнне ад 11 снежня захавала ўсе галоўныя прынцыпы закона, выдадзеныя ад 6 жніўня: выбары заставаліся не ўсеагульнымі, не роўнымі і не прамымі. Да трох ранейшых выбарчых курый — землеўладальніцкай, гарадской і сялянскай — дадавалася чацвёртая — рабочая. Але ў апошняй курыі выбарчае права мелі рабочыя прадпрыемстваў, дзе колькасць працуючых мужчын ва ўзросце больш за 25 гадоў перавышала 50 чалавек.

Не атрымалі выбарчых правоў асобы маладзейшыя за 25 гадоў, жанчыны, рабочыя дробных прадпрыемстваў, а таксама рабочыя, занятыя не ў прамысловасці і ў

гандлі, — чыгуначныя (акрамя майстэрань), будаўнічыя і інш. У Беларусі толькі 10—15 % рабочых мелі выбарчае права. У 21 з 71 губерні Расійскай імперыі рабочыя не мелі свайго прадстаўніцтва, у тым ліку і ў Віцебскай губерні.

У памешчыцкай курыі адзін выбаршчык прыходзіўся на 2 тыс. землеўладальнікаў, у гарадской — на 4 тыс., у сялянскай — на 30 тыс., у рабочай — на 90 тыс. Не мелі выбарчых правоў сялянская беднага і батракі. Паводле закона, памешчыкі і буйная буржуазія мелі перавагу на выбарах — 54 % месцаў выбаршчыкаў. У Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай губернях памешчыкам належала 46 % галасоў на апошняй стадыі выбараў, сялянам — 46 %, гараджанам — 16 %.

У Палажэнні аб Думе былі раздзелы, прысвечаныя яе складу і структуры, пытанням кампетэнцыі, рэгламенту работы. Дума склікалася на пяць гадоў, але імператар меў права датэрміновага яе роспуску з абавязковым прызначэннем новых выбараў. Ад Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай губерняў у Думу выбіраліся 36 дэпутатаў.

Дэпутатам у перыяд сесіі выплачвалі 10 руб. за працоўны дзень. З 1908 г. дэпутатам было ўстаноўлена штогадовае забеспячэнне ў памеры 4200 руб., якое выплачвалася штомесяц па 350 руб. [2, с. 28—29].

23 красавіка 1906 г. былі афіцыйна абнародаваны «Асноўныя Дзяржаўныя законы Расійскай імперыі» — фактычна першая Расійская канстытуцыя. Дакумент выкрэсліваў са сферы ўлады Думы шэраг важных палітычных пытанняў (кантроль над арміяй, замежныя справы). Асноўны закон даваў выключнае права царскай уладзе на амністыю і факт адказнасці ўрада толькі перад імператарам.

Першая Дзяржаўная дума праіснавала 72 дні. Яна была абвешчана Мікалаем II крамольнай. Дэпутаты абвінавачваліся ў тым, што яны ўхіляліся ад заканадаўчай працы, імкнуліся ў абход цара змяніць асноўныя законы краіны і сваёй уладай вырашыць аграрнае пытанне. Аднак з-за небяспекі паўтору падзей 1905 г. змяніць выбарчы закон ад 6 жніўня (Указ ад 11 снежня) 1905 г. не адважыліся. Улічваючы палітычную сітуацыю ў краіне, Старшыня Савета Міністраў І. А. Гарамыкін у чэрвені 1906 г. прыйшоў да высновы, што «не застаецца нічога іншага, як распусціць Думу, затым склікаць яе зноў, уплываючы ўсімі магчымымі сродкамі на выбары, а калі і гэта не дапаможа, то зноў распусціць Думу і выдаць новы выбарчы закон». Па яго даручэнні ў маі 1906 г. да распрацоўкі закона прыступіў таварыш міністра ўнутраных спраў С. Я. Крыжаноўскі [7, с. 25].

Другая Дзяржаўная дума пачала працу 20 лютага 1907 г., 10 мая ў Думе выступіў новы прэм'ер П. А. Сталыпін. Апошнія словы яго прамовы набылі шырокую вядомасць. «У гэтай справе (рэформ. — Аўт.) патрэбна цяжкая чорная праца, — гаварыў ён. — Мы прапануем вам сціплы, але дакладны шлях. Ворагі дзяржаўнасці імкнуцца выбраць шлях радыкалізму, адмовы ад гістарычнага мінулага Расіі, забыцця яго культурных традыцый. Ім неабходны вялікія ўзрушэнні, нам патрэбна вялікая Расія». Роспуск II Думы практычна станавіўся вырашанай справай . Указам ад 3 чэрвеня 1907 г. Дума другога склікання была распушчана. Адначасова надрукаваны і змяненні «Палажэння аб выбарах». Па Маніфесце ад 3 чэрвеня права адмяняць выбарчыя законы і выдаваць новыя захоўвалася за царом.

Выбарчы закон ад 3 чэрвеня 1907 г. рэзка павялічваў прадстаўніцтва ад памешчыкаў і буйной буржуазіі за кошт скарачэння колькасці прадстаўніцтва ад рабочых, сялян і часткова ад гараджан. Гэта знайшло адлюстраванне ў размеркаванні колькасці выбаршчыкаў у губернскіх сходах. Землеўладальніцкай (памешчыцкай) курыі давалася 49,6 % ад агульнай колькасці выбаршчыкаў для 50 губерняў Еўрапейскай Расіі замест 32,7 % месцаў пры выбарах у першыя дзве Думы. Буйной буржуазіі, якая ўваходзіла ў склад першага разраду гарадскіх выбаршчыкаў, было дадзена права выбраць 15 % выбаршчыкаў, дробнай буржуазіі і інтэлігенцыі (другі разрад) — 11 %. Рэзка скарачалася коль-

касць выбаршчыкаў ад сялян (з 42,3 да 21,8 %) і нацыянальных ускраін — Царства Польскага, Каўказа і інш. Народы Сярэдняй Азіі, нярускія народнасці Забайкалля і інш. былі пазбаўлены права пасылаць сваіх дэпутатаў у Думу. Як і раней, да выбараў не дапускаліся ваеннаслужачыя, навучэнцы і жанчыны. Не мелі выбарчых правоў сялянская беднота і парабкі. Выбарчым правам карысталіся толькі 1,5 % насельніцтва Расіі [8, с. 23].

Улічваючы «заклікі аб дапамозе», якія паступалі з заходніх губерняў ад «Саюза рускага народа», «Саюза 17 кастрычніка» аб абароне правоў «карэннага рускага насельніцтва»«, міністр унутраных спраў распарадзіўся аб раздзяленні з'ездаў землеўладальнікаў на «рускае» і «польскае» аддзяленні ў Гродзенскай, Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай губернях. Да «рускага» аддзялення былі аднесены праваслаўныя беларусы, немцы, татары, да «польскага» – беларускія сяляне-католікі і латышы (у Віцебскай губерні). Рускае насельніцтва Віленскай губерні атрымала права выбіраць свайго дэпутата ў Думу асобна ад насельніцтва іншых нацыянальнасцей.

Першы разрад гарадскіх выбаршчыкаў выбіраў 15 % ад усёй колькасці выбаршчыкаў Еўрапейскай Расіі, другі — 11,2 %, а ў заходніх губернях адпаведна — 11,8 % і 9,1 %. Па новым выбарчым законе яўрэйскае насельніцтва заходніх губерняў фактычна пазбаўлялася магчымасці ўплываць сваім удзелам на выніκі выбараў. Урад імкнуўся не дапусціць у склад дэпутатаў Думы «іншародцаў» і «іншаверцаў», зыходзячы з таго, што «Дзяржаўная дума павінна быць рускай і па духу».

Першыя з'езды ва ўсіх гарадах Мінскай губерні былі падзелены на тры аддзяленні: да першага былі аднесены выбаршчыкі «рускай» нацыянальнасці (далучаліся праваслаўныя беларусы, немцы, татары), да другога — «палякі» (далучаліся беларускія сяляне-католікі), да трэцяга — яўрэі. Кожнае з аддзяленняў выбірала аднаго выбаршчыка незалежна ад колькасці. Напрыклад, у Мінскім павеце па адным выбаршчыку выбіралі 154 «рускіх», 241 «паляк» і 844 яўрэі [6, с. 121]. На два аддзяленні («рускія» і «нярускія») падзяліліся гарадскія выбаршчыкі ў Дзвінскім, Гродзенскім, Веластоцкім і Бабруйскім паветах. У Віленскім павеце адно аддзяленне з'езда складалі асобы «польскага» паходжання, а другое — «асобы, што не належалі да польскай нацыянальнасці».

Такім чынам, на выбарах у III Дзяржаўную думу беларусы былі аднесены да «рускай» (праваслаўныя) і «польскай» (католікі) курый, што было безумоўнай перашкодай для фарміравання нацыянальнай «самасвядомасці», да чаго заклікала газета «Наша ніва». Пазіцыю выдання газеты можна назваць «прагрэсісцкай», таму што яна падтрымлівала прадстаўнікоў усіх нацыянальнасцей краю (рускіх, палякаў, яўрэяў), хто патэнцыяльна мог выступіць «за зямлю для мужыкоў» [9, с. 268].

Падзел насельніцтва на нацыянальныя курыі паўплываў на тое, што выбарчыя кампаніі і ў III, а затым і ў IV Думы характарызаваліся змаганнем вакол нацыянальных пытанняў. Рэдактар-выдавец «Нашай нівы» А. Уласаў балатаваўся ў IV Дзяржаўную думу. На старонках газеты ўсё часцей гучала патрабаванне аўтаноміі беларускіх зямель у складзе Расійскай імперыі [9, с. 269].

Вынікам заблытанага выбарчага заканадаўства было непрапарцыянальнае прадстаўніцтва; насельніцтва падзялялася па цэнзавай, рэлігійнай і нацыянальнай прыкметах. У выбарчай сістэме Расіі побач з рэпрэсіўнымі дзейнічалі і даволі дэмакратычныя абмежаванні. Напрыклад, асобы, якія займалі паліцэйскія пасады, а таксама пасады губернатараў, віцэ-губернатараў, граданачальнікаў і іх памочнікаў, былі пазбаўлены права голасу на той падставе, што маглі істотна ўплываць на зыход усяго галасавання. У нашы дні, калі працэсы глабалізацыі церпяць крах, увайшоўшы ў супярэчнасці з нацыянальнымі элітамі і афармленнем нацыянальных дзяржаў, неабходны шырокі вопыт даследаванняў гісторыі электаральных працэсаў у мінулым.

**Спіс цытаванай літаратуры**


1. *Циунчук, Р. А.* Думская модель парламентаризма в Российской империи : этноконфессиональное и региональное измерения / Р. А. Цнунчук. — Казань : Фен, 2004. — 416 с.
2. *Забаўскі, М. М.* Расійская Дзяржаўная дума ў лёсах Беларусі (1906—1917 гг.) / М. М. Забаўскі. — Мінск : Беларус. дзярж. пед. ун-т імя Максіма Танка, 2008. — 267 с.
3. *Смалянчук, А. Ф.* Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864 — люты 1917 г. / А. Ф. Смалянчук. — СПб. : Неўскі прасцяг, 2004. — 404 с.
4. Докумеиты общероссийских партпй и организаций либерального направления в Беларуси (1905—1918 гг.): хрестоматия / авт.-сост. Д. С. Лавринович. — Могилёв : Могилёвский гос. ун-т имени А. А. Кулешова, 2010. — 344 с.
5. *Бондаренко, К. М.* Правые партии и их организации в Беларуси (1905—1917 гг.) / К. М. Бондаренко. — Могилёв : Могилёвский гос. ун-т имени А. А. Кулешова, 2010. — 416 с.
6. З гісторыяй на «Вы» : Артыкулы, дакументы, успаміиы / уклад. і уступ. слова Я. Запрудніка. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1994. — Вып. 3. —347 с.; *Запруднік, Я.* Беларусь на гістарычных скрыжаваннях / Я. Запруднік. — Мінск : Бацькаўшчына, 1996. — 264 с.; *Козицкий, Н. Е.* Идеи автономизма в России в начале XX в. / Н. Е. Козицкий // Государственное управление: история и современность. Межд. науч. конф. (29—30 мая 1997 г.) / Университет гуманит. ; редкол. : В. А. Кувнинов (гл. ред.) [и др.]. — М., 1998. — С. 138 — 141.
7. *Аврех, А. Я.* Столыпин и судьбы реформ в России / А. Я. Аврех. — М. : Политиздат, 1991.
8. *Беркевич, А.* Царский избирательный закон / А. Беркевич. — Л. : Леииздат. тип. имени Володарского, 1938. — 136 с.
9. *Унучак, А. У.* «Наша иіва» і беларуская нацыянальная ідэя (1906—1915 гг.) : Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў к. XVIII — пач. XX ст. : у 2 кн. / А. У. Унучак; рэдкал. : А. А. Каваленя [і інш.]; Нац. акад. навук. Беларусі, Ін-т гісторыі. — Мінск : Беларус. навука, 2011. — 584 с.



## ДА ВЕДАМА АЎТАРАЎ І ПАДПІСЧЫКАЎ!

Рэдакцыя прымае да разгляду матэрыялы на беларускай і рускай мовах аб'ёмам да 15 тыс. знакаў з прабеламі ў двух экзэмплярах (пажадана з дыскам, можна дасылаць электроннай поштай).

Артыкулы павінны быць надрукаваны на белай паперы праз два інтэрвалы на адным баку ліста (фармат А4, тэксты, набраныя на камп'ютары, кегль 14).

Фотаздымкі прымаюцца чорна-белыя і добрай якасці.

Неабходна пазначыць прозвішча, імя і імя па бацьку аўтара, месца працы, пасаду, вучоную ступень, вучонае званне, хатні адрас, тэлефоны, пашпартныя звесткі (серыя, иумар, калі і кім выдадзены, асабісты нумар, адрас прапіскі). Без гэтых звестак матэрыялы разглядацца не будуць.

Паколькі наш часопіс не паступае ў розиічны гандаль, чытачы і аўтары могуць набыць яго па падпісцы альбо зрабіць заяўку на патрэбную колькасць экзэмпляраў часопіса па тэлефоне 297-93-22 (аддзел маркетынгу).

Рэдакцыя не заўсёды падзяляе думкі аўтараў. Апошнія нясуць адказнасць за ўсю інфармацыю, якая ўтрымліваецца ў артыкуле.

Рукапісы аўтарам не вяртаюцца.